Так было ва ўсе часы. Сваю місію, наканаванасць разумеў і Янка Купала. Нездарма свой дар ён параўноўваў з музычным інструментам — жалейкай, спеў якой пранікае ў душы людзей і абуджае іх, натхняе. Гэткае параўнанне, як і цяга да музыкі, ідзе са старажытнасці. Творцы заўсёды звяртаюцца да музыкі. Мелодыяй сваёй ліры Арфей зачароўваў не толькі простых слухачоў. Сваёй ігрой ён утаймаваў сабаку Кербера, які ахоўваў царства мёртвых, расчуліў сэрцы Аіда, валадара гэтага царства, і багіні Персефоны — і яны дазволілі вывесці яму каханую жонку Эўрыдыку на зямлю. Пяшчотнымі пералівамі гусляў Садко спыняў буры на моры-акіяне. Неслі праўду і ўваскрашалі гістарычную памяць украінскія кабзары і лірнікі. Пад спеў гусляў, ліры, дуды, пад мелодыю жалейкі, дудкі, скрыпкі беларусам раскрываліся таямніцы жыцця, вымалёўвалася дарога да шчасця. Беларускім Дударом назвалі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіч, а Уладзіслава Сыракомлю сябры ахрысцілі Вясковым Лірнікам. І паэтычныя зборнікі папярэднікаў Янкі Купалы мелі музычныя назвы — «Дудка беларуская» Францішка Багушэвіча, «Скрыпка беларуская» Цёткі.

Паэтычная эстафета перайшла да новага пакалення творцаў, чыя літаратурная дзейнасць маштабна разгарнулася ў першай чвэрці мінулага стагоддзя. Якуб Колас стварыў ліра-эпічны вобраз музыкі. Першы апублікаваны твор Максіма Багдановіча таксама пра музыку. А Янка Купала ўзначаліў трыумфальнае шэсце творцаў, якія прасвятляюць суайчыннікаў, вядуць іх да запаветнай мары. Народ даў ім несмяротнае імя — ПЕСНЯРЫ...

Міхась ШАВЫРКІН

Ад рэдакцыі. Шаноўныя выхавальнікі, раім выкарыстаць матэрыялы і ілюстрацыі, якія змяшчаліся ў нашым часопісе раней («Пралеска» № 6 за 2002 год, № 6 за 1997 год і інш.)

СВЯТКУЕМ КУПАЛЛЕ

Ірына ЖЫДОВІЧ,
Ніна ЖАЛНЯРОВІЧ,
метадысты I катэгорыі аддзела гульні і цацкі Метадычнага цэнтра Нацыянальнага інстытута адукацыі

ДЛЯ ТАГО каб жыць асэнсавана і з пачуццём асабістай годнасці, кожнаму чалавеку патрэбна ведаць свае вытокі, захоўваць памяць аб мінулым свайго народа, шанаваць традыцыі, любіць Радзіму. Выхоўваць гэтыя пачуцці трэба з ранняга дзяцінства. Менавіта ад нас, дарослых, залежыць, ці заахвоцяцца дзеці маўленнем на роднай мове, ці ўзнікне ў іх зацікаўленасць гісторыяй роднай краіны, ці прывабіць іх незвычайны свет беларускага народнага фальклору, ці ўзнікнуць у іх светлыя пачуцці прыхільнасці да тых мясцін, дзе яны нарадзіліся і выраслі. Менавіта мы, дарослыя, нясём адказнасць за тое, каб з немаўляці вырасла нацыянальна свядомая асоба.

Праблема далучэння дзяцей да сваёй нацыянальнай культуры набывае актуальнасць у наш час у сувязі з агрэсіўным наплывам масавай культуры і стратай прадстаўнікамі розных народаў духоўнай сувязі са сваёй нацыянальнай культурай. Таму сусветная грамадскасць занепакоена падзеннем духоўнасці ў падрастаючага пакалення, што выклікае вялікія цяжкасці ў фарміраванні ў дзяцей такіх якасцей асобы, як разуменне і прыняцце роднай гісторыі, культуры, павага да культуры іншых народаў з яе нацыянальнымі асаблівасцямі.

Дзейснымі сродкамі, якія дазваляюць пазнаёміць дзяцей з беларускай нацыянальнай культурай і рэалізаваць сябе як яе прадстаўніка, з'яўляюцца:

- *Родная мова.* Менавіта з пазнання мовы, з усведамлення яе як найвялікшай каштоўнасці і святыні свайго народа пачынаецца станаўленне самасвядомасці дашкольнікаў. Родная мова — гэта магутны сродак, з дапамогай якога дзіця далучаецца да продкаў, што робіць яго прыхільным да бясконцага шэрагу пакаленняў, якія жылі да яго і будуць жыць пасля яго.
- *Сродкі матэрыяльнай і духоўнай культуры.* Гэта творы беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, вусная народная творчасць, наглядна-ілюстрацыйныя матэрыялы, народныя цацкі, сучасныя цацкі з нацыянальным каларытам, якія адлюстроўваюць персанажы беларускіх народных казак, элементы беларускага быту, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
- *Элементы нацыянальнага касцюма і ўпрыгожванні,* якія выкарыстоўваюцца для тэатралізаванай дзейнасці дзяцей.
- *Мадэлі прадметаў нацыянальнай матэрыяльнай культуры,* прызначаныя як для разглядвання, так і для самастойнай дзейнасці дзяцей у спецыяльна арганізаваных умовах.
- *Традыцыі, звычаі, абрады, святы, прысвяткі.*

ВАЖНЫМ сродкам фарміравання ў дзяцей цікавасці і павагі да культурнай спадчыны з'яўляюцца народныя святы. Свята — гэта найвышэйшы ўзровень развіцця духоўнай культуры, які адпавядае стану чалавека ў тую ці іншую пару года, у тым або іншым узросце. У нашы дні вяртаецца спрадвечная традыцыя ўдзелу ў святах дзяцей побач з дарослымі. Гэта вельмі пазітыўны момант, бо менавіта так перадаваліся з пакалення ў пакаленне народныя традыцыі. Дзеці з радасцю, энтузіязмам і ахвотай удзельнічаюць у народных святах, дакранаюцца да фальклору, што становіцца для іх крыніцай выключнай прыгажосці, маральнага здароўя, крыніцай, якая светлым духоўным адбіткам асвечвае і ўпрыгожвае чыстыя дзіцячыя душы. Невыпадкова праграма дашкольнай адукацыі «Пралеска» рэкамендуе пашыраць уяўленні дзяцей аб самых значных і найбольш самабытных каляндарных святах беларусаў: Каляды, Гуканне вясны, Вялікдзень, Дзяды, Радаўніца і інш.

Дапамагчы педагогам дашкольных устаноў у арганізацыі работы па падрыхтоўцы сваіх выхаванцаў да ўспрымання традыцыйнага народнага свята Купалля — мэта публікацыі. Мы раім педагогу спачатку ўдакладніць свае веды пра гэтае прыгожае летняе свята, пабудаванае паводле этнаграфічна-фальклорнай спадчыны, напомніць, у чым яго сэнс, адкуль яно бярэ свой пачатак, што азначаюць звычаі, вераванні, рытуалы падчас яго.

Купалле адзначаецца ў ноч з 6 на 7 ліпеня ў гонар летняга сонцавароту. У купальскіх абрадах і рытуалах чалавек з аднаго боку выказваў падзяку Агню, Вадзе і Зямлі, а з другога — сваім вяселлем і радасцю перадаваў аднадушнае спалучэнне са станам прыроды, яе найвышэйшым росквітам і зямной прыгажосцю.

Пачынала купальскае свята дашлюбная моладзь. Дзяўчаты збіралі зёлкі і кветкі для вянкоў. Хлопцы тым часам рыхтавалі месца для купальскага вогнішча на высокім беразе ракі ці возера, на паляне, каля жыта. Праводзілі абрад здабывання «жывога» агню — церлі сухія асінавыя палкі. Усю ноч ля купальскага агню гучалі песні, ладзіліся карагоды, гульні. Хлопцы і дзяўчаты купаліся ў вадзе, скакалі праз вогнішча паасобку, накрыж і парамі. Гэтыя дзеянні павінны былі, на думку нашых продкаў, паспрыяць ачышчэнню душы чалавека за дапушчаныя грахі, зняць злыя чары і хваробы, дапамагчы ў здзяйсненні задуманага.

Ля вогнішча частаваліся купальскімі абрадавымі стравамі, варажылі, плялі вянкі. Са словамі «Ляці, ляці, вяночак, лаві, лаві, дружочак» кідалі на ваду вянкі (куды вянок паплыве — туды дзяўчына замуж пойдзе).

Пасля скокаў праз вогнішча дзяўчаты і хлопцы ішлі шукаць чароўную папараць-кветку незвычайнай, асляпляльнай прыгажосці, якая быццам бы цвіце толькі адзін раз у год апоўначы, на Купалле і вяртае чалавека да адзінства з прыродай: уладальнік кветкі пачынаў разумець «размову» жывёл, птушак і дрэў. Папараць-кветка адмыкала ўсе замкі, разбурала перашкоды, дапамагала здабываць пажаданае.

Згодна са старажытнымі язычніцкімі павер'ямі, невядомыя сілы шкодзілі і палохалі шукальнікаў чароўнай кветкі. Толькі чалавек са смелым сэрцам і чыстай душой мог адважыцца сарваць гэтую кветку, не пабаяцца ўступіць у адзінаборства з нячыстай сілай, і тады яму будуць падуладны ўсе таямніцы і чары.

Заканчвалася купальскае свята ля ракі. Яго ўдзельнікі назіралі за ўзыходам сонца. Яно нібы «гуляла», пералівалася, дзялілася на некалькі частак, якія разбягаліся і зноў зліваліся ў адзінае кола. За гэтым трэба было назіраць або прыжмурыўшы вочы, або не маргаючы.

Свята Купалле — гэта гімн сонцу, напамін аб тым, што святло заўсёды перасільвае цемру. Прымаючы ў ім удзел, дзеці будуць чэрпаць веру ў лепшую будучыню і шчасце.

ТРАДЫЦЫЙНЫЯ народныя святы — даволі складаная для ўспрымання і разумення з'ява, якая выходзіць за межы асабістага вопыту дзяцей. Таму мы прапануем педагогу наглядныя (малюнкі-адгадкі) і гульнявыя (загадкі) сродкі, выкарыстанне якіх, на нашу думку, павялічыць зацікаўленасць дзяцей і дапаможа ім зразумець сутнасць гэтай з'явы.

А хто з нас не любіць загадкі? Яны дазваляюць у займальнай, вясёлай форме навучыць чаму-небудзь, распавесці пра што-небудзь добрае, замацаваць і пашырыць веды і ўяўленні аб навакольным свеце. Інакш кажучы, яны знаходзяцца на тонкай мяжы паміж сур'ёзным і жартоўным, адначасова валодаючы і тым, і другім.

Як адносяцца да загадак дзеці? Яны таксама іх вельмі любяць. Вядомы пісьменнік Джані Радары растлумачвае гэтую прыхільнасць тым, што яны ў канцэнтраванай, амаль сімвалічнай форме адлюстроўваюць дзіцячы вопыт пазнання рэчаіснасці. Радасць выклікае як сам працэс адгадвання загадкі, так і вынік своеасаблівай работы розуму, бо прывучае дзіця да лагічнага мыслення, развівае здольнасці да аналізу, абагульнення, умення самастойна рабіць вывады.

Заўвага. Артыкул пабудаваны паводле настольна-друкаванай гульні «Пошукі папараць-кветкі», распрацаванай у аддзеле гульні і цацкі Метадычнага цэнтра НІА.

Загадка ставіць перад дзецьмі пытанні: што адкуль? Што з чаго зроблена? Што для чаго патрэбна? Яна нібы паказвае ім прадмет то адным бокам, то другім, то звяртае ўвагу на знешні выгляд, то вызначае сутнасць і прызначэнне прадмета. У простай і цікавай форме загадкі дапамагаюць дзецям устанаўліваць і разумець сувязі паміж назвамі прадметаў, іх прыкметамі і функцыянальнымі магчымасцямі. Акрамя таго, даюць магчымасць па-іншаму зірнуць на самыя звычайныя прадметы, як казаў К.Дз. Ушынскі, даюць карцінне апісанне прадмета.

Аўтарскія (метадыст І.І. Жыдовіч) загадкі пра галоўныя атрыбуты купальскага свята (міфалагічныя персанажы, зёлкі, абрадавыя купальскія стравы) напоўнены пазнавальным сэнсам. Яны пабудаваны з улікам адпаведнасці тэматыкі загадак выхаваўча-адукацыйным задачам, вызначаным праграмай «Пралеска», паўнаты і канкрэтнасці адлюстравання разнастайных характарыстык прадметаў, а таксама асаблівасцей інтарэсаў дзяцей, якія накіраваны на ўсведамленне функцый, мэтавых прызначэнняў і ўзаемасувязей прадметаў. У большай ці ў меншай ступені ў прапанаваных загадках падаецца галоўная характарыстыка прадмета — яго функцыі, якія ў канчатковым выніку вызначаюць яго. Такая пабудова зместу загадак, на наш погляд, значна палегчыць успрыманне і разуменне дзецьмі даволі складанага матэрыялу, будзе садзейнічаць паспяховасці вырашэння задач.

АСНОЎНАЙ формай мыслення дзяцей старшага дашкольнага ўзросту, як вядома, з'яўляецца наглядна-вобразнае. Таму выкарыстанню нагляднага матэрыялу ў дашкольнай педагогіцы адводзіцца асаблівая роля. Шматлікія педагогі мінулага адзначалі вялікую каштоўнасць заняткаў, дзе выкарыстоўваліся ілюстрацыйныя матэрыялы. Так, Е.І. Ціхеева падкрэслівала, што карцінкам і карцінам як фактару разумовага развіцця дзіцяці павінна быць адведзена пачэснае месца з першых гадоў жыцця. Карціны, па яе сцвярджэнню, значна пашыраюць поле непасрэднага назірання дзіцяці. Вобразы, якія выклікаюцца імі, вядома, менш яскравыя, чым тыя, што дае рэальнае жыццё, але ва ўсякім разе яны непараўнальна больш яскравыя і выразныя, чым вобразы, якія выклікаюцца толькі словам. Бачыць жыццё ва ўсіх яго праявах уласнымі вачыма немагчыма, таму карціны і карцінкі валодаюць такой вялікай каштоўнасцю.

Карцінкі-адгадкі (мастак М.А. Анціпкіна) пра галоўныя атрыбуты купальскага свята якраз і дапамогуць уявіць прадметы і з'явы, якіх няма ў вопыце дзіцяці, якія нельга ўспрыняць непасрэдна. Гэты наглядны сродак прапануецца таксама і для ўзмацнення эмацыянальнага ўспрымання матэрыялу аб Купаллі, паколькі прыгожыя, яскравыя малюнкі заўсёды выклікаюць у дашкольнікаў эмацыянальны водгук.

Сакавітыя фарбы малюнкаў выбраны мастаком невыпадкова, а з улікам асаблівасцей успрымання колеру дзецьмі дашкольнага ўзросту. Яны адхіляюць бляклясць колеру, іх не прыцягвае «вялая», некантрастная каляровая гама, у той жа час усё яркае ўспрымаецца імі як прывабнае, прыгожае. Дасягнутая мастаком выразнасць вобразаў дазваляе зразумець характар міфалагічных персанажаў: гарэзлівая Кікімара, хітраваты Цур, дзікаваты Лясун, засмучаны Балотнік, летуценная Купалка, дамавіты Хатнік, велічны Вадзянік, працавіты Палявік...

У малюнках зёлак і абрадавых купальскіх страў максімальна вытрыманы патрабаванні адносна падабенства з сапраўднымі прадметамі. Рэалістычнасць выяў у дапаўненні з дакладнай дэталізацыяй дапаможа вашым выхаванцам падрабязна разгледзець прадмет, яго састаўныя часткі, якія ў жыцці не заўсёды ўдаецца заўважыць. Мы лічым, што такія асаблівасці перадачы выяў будуць садзейнічаць паглыбленню, удакладненню ўяўленняў дзіцяці аб навакольным свеце, дадуць ім магчымасць пазбегнуць некаторых цяжкасцей пры ўспрыманні складанага матэрыялу і атрымаць дадатковую магчымасць пабываць у сітуацыі поспеху — самастойна адгадаць загадку.

Спадзяёмся, што інфармацыйны і ілюстрацыйны змест артыкула будзе для вас, паважаныя калегі, цікавым і карысным. Мы разам з вамі зробім пасільны ўклад у вялікую справу далучэння дзяцей да духоўнай спадчыны беларускага народа.

ЗАГАДКІ

Стаіць дзед каля дарожкі
І дарослым, і дзеткам
Чапляе па брошцы.
Калі адварам яго мыцца —
Скура на шчочках загаіцца.
А калі яго папіць —
Можна ныркі падлячыць.
(Дзядоўнік.)

Расту сярод елак,
Сасны, бяроз, дубоў.
Лісты, як крылы птушкі,
Лунаюць між кустоў.
Пазбаўлю болю страўнік,
Плады я зберагу.
Для коней — ядавітая,
А свінняў — накармлю.
(Папараць.)

Гаючая расліна,
Гаркавая на смак.
Дапамагае пры атручваннях,
Жывёл пужае яе пах.
(Палын.)

Лекавая меданосная расліна
Па ўсёй Беларусі расце,
Двума колерамі цвіце:
Ярка-жоўты — дзяўчына,
Сіне-фіялетавы — хлапчына.
(Іван-ды-Мар'я.)

Стаіць хлапчына ці дзяўчына
У сінім капялюшы ці хусціне.
Жытняе поле аздабляе,
Але ўраджаю перашкаджае.
Адвар яе ад бародавак пазбаўляе
І зроку дапамагае.
(Валошка.)

Дзікая жыхарка
ўзлесяў і палёў,
Сяджу сярод травы я
Трохкаляровым матыльком.
Ад кашлю пазбаўляю,
Зубны змяншаю боль
І скуру ачышчаю —
Зрабі з мяне настой.
(Браткі або фіялка трохколерная.)

Жаўтавокая бландзінка,
Красую ў полі я.
Знаёма ўсім як парфумер
і лекар:
Дапамагаю людзям я.
Магу зменшыць боль,
Пазбавіць запалення.
Выпі з мёдам мой настой —
Атрымаеш у сне спакой.
Памый маім адварам валасы —
Стануць яны небывалай красы.
(Рамонак.)

Не агонь я, але
апячы магу цябе.
Пустазелле я, але
шмат вітамінаў у мяне.
Звары з мяне пажыўны боршч
Ці з'еш салату —
Ты атрымаеш маю моц
І пражывеш багата.
(Крапіва.)

Гаспадар азёр і рэк,
Дзед з зялёнай скурай.
У яго азызлы твар,
Часам ён пануры.
(Вадзянік.)

Я стары кудлаты дзед,
Незнарок раблю шмат бед.
У цёплай хаце жыву,
З гаспадарамі жартаваць люблю.
(Хатнік.)

Малая брыдкая дзяўчына
Люблю я гадасці рабіць.
Калі ў хаце апынуся —
Не дам табе спакойна жыць.
(Кікімара.)

Дзікаваты цар лясоў
З лупатымі вачыма.
Ён хаваецца ў дупле —
Вельмі ён пужлівы.
(Лясун.)

Я нячысцік з балота,
Жыву сярод чароту.
Пастку зраблю —
Заманю цябе ў дрыгву.
(Балотнік.)

Я палена з доўгім носам
У полі межы сцерагу.
Калі ў дом мяне запросіш,
І ачаг твой зберагу.
(Цур.)

Стораж збожжавых палёў,
Як зямелька, чорны.
З траўкай замест валасоў
Доўгай і зялёнай.
(Палявік.)

Прыгожая дзяўчынка
З вянком на галаве.
Жыве на дрэве, у жыце,
Таксама ў вадзе.
Да смерці заказыча,
Сустрэнься толькі з ёй.
А будзеш даспадобы –
Пацягне за сабой.

(Русалка.)

Каб атрымаць мяне, трэба
Кіслае малако пакінуць
У гарачай печы.
Пасля з яго сыроватка
павінна сцячы.
Затым смятанкі і солі дадай,
Усё добра перамяшай.
Пад прэс пакладзі
І трошкі падсушы.

(Сыр.)

Заквасіць мяне можна з цеста
ці з хлеба жытнёвага,
З соку бярозавага або кляновага.
Пасля гэтага мяне
ты можаш піць,
Смагу сваю спаталіць.

(Квас.)

Я выраб з пшанічнай, жытняй
ці грэцкай мукі.
Ты мяне на падмазцы спячы.
Да стала падай з мачаннем
ці з падсмажаным салам,
Але, каб наесціся, аднаго мяне
будзе мала.

(Блін.)

Вазьмі малака ці вады,
Дадай лыжку мукі туды.
Добра ўсё раскалаці.
З падсмажаным салам,
Каўбасамі, свінымі рабрынкамі
У печы з прыправамі патушы.
Падай да бліноў мяне –
Будзе смачней табе.

(Верашчака або мачанка.)

Засмажаная на патэльні ў печы.
Карысная і смачная,
З жоўтым вочкам, белая,
Даспадобы дарослым і дзецям,
Здагадайся, хто я!

(Яечня.)

Шчаўе ці буракі звары і астудзі.
Дадай накрышаныя
свежыя агуркі,
Вараныя яйкі,
смятану, соль і кроп.
Страва гэта, каб ты ў спёку
Працаваць змог.

(Халаднік.)

Я з жыта, пшаніцы, ячменю
ці талакна,
Звары мяне і дадай мёду –
Атрымаецца смаката!

(Кулага.)

Я тоўсты,
з мукі зроблены блінок,
Усярэдзіне – мяса,
яйкі ці тварог.

(Сачні.)

МІФАЛАГІЧНЫЯ ПЕРСАНАЖЫ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

Лясун (Лешы, Лесавік, Лясны дзед) — дух лесу, жыве ў дупле старога дрэва. Стараецца завабіць спадарожніка ў глыб лесу, напалохаць.

Бялун (Белбог) — высокі сівы дзед з доўгай белай барадой, у белым адзенні з кіем ў руках. На плячах у яго сядзяць птушкі, каля ног бегаюць зайчаняты. Дух жніва, дапамагае людзям жаць збожжавыя. Шчодра даруе багацце таму, хто яму паслужыць.

Вадзянік (Вадзяны дзед, Вірнік, Ціхоня) — нячысцік, нібы паўрыба. Гаспадарыць у стаячай ці рухомай вадзе. Выглядае старым дзедам, у якога расплывісты твар з доўгай, часам да кален, лапацістай барадою і такія ж доўгія валасы на галаве. Жывот у яго азызлы, скура бліскучая, ногі з перапончатымі пальцамі.

Палявік — сцеражэ хлебныя палі. Цела чорнае, як зямля, вочы рознакаляровыя; замест валасоў галава пакрыта доўгай травой. Часам яго малююць у вобразе старога ў белым развяваючымся адзенні. Яго з'яўленне суправаджаецца моцным ветрам.

Балотнік (Балацянік) — дух балота, сівы стары з шырокім жаўтаватым тварам. Заваблівае спадарожнікаў у дрыгву.

Цур — нячысцік, які сцеражэ межы зямельных уладанняў. Палена — драўлянае адлюстраванне Цура.

Кікімара (Вешчыца) — злы дух з плямамі гразі і пылу, у старой вопратцы. У хаце грукае, стараецца выжыць адтуль людзей.

Купальскі дзядок — добры дух. Ходзіць з бліскучым кошыкам, у які збірае купальскія кветкі.

Русалка (Купалка, Вадзяніца, Каўка) — прыгожая дзяўчына з доўгімі распушчанымі валасамі, часта з вянком на галаве і без вопраткі. Без хваста. Жыве ў рэках, азёрах, у жыце і на дрэвах. Можа заказытаць да смерці спадарожніка ці «захапіць» з сабой на дно.

Дамавы (Хатнік, Падпечнік, Хоплік) — заступнік дома. З'яўляецца ў выглядзе старога дзядка з сівой барадою і доўгімі сівымі валасамі. Ходзіць у белай кашулі, падпярэзанай лыкам ці дзягой.

АБРАДАВЫЯ КУПАЛЬСКІЯ СТРАВЫ

Сачні — у беларусаў — тоўстыя мучныя бліны з начынкай (тварог, мяса, яйкі, яблыкі, вішні, мак і інш.). Часта іх пяклі ў дарогу, бралі з сабой у поле.

Кулага — у беларусаў — каша з жыта, пшаніцы, талакна або ячменю. Варылі таксама яе з ягад, дадавалі муку, мёд, цукар.

Каўбасы — кішачныя абалонкі свінняў, напоўненыя ялавічынай, свінінай з прыправамі.

Бліны — традыцыйны беларускі мучны выраб. Пшанічную, жытнюю, ячную, грэцкую ці аўсяную муку замешваюць на малацэ або сыраквашы, сываратцы, часам дадаюць яйкі, цукар. Пякуць на падмазцы. Падаюць з мачанкай, падсмажаным салам, смятанай. Тоўстыя бліны — аладкі, тонкія — наліснікі.

Верашчака (мачанка) — традыцыйная беларуская страва — мачанне для бліноў. Падсмажаныя кавалачкі сала, каўбасы, свіныя рабрынкі з вострымі прыправамі падкалочваюць мукой і тушаць у печы.

Квас — напітак з заквашанага жытняга цеста ці хлеба з соладам, з сухароў, з садавіны, ягад, бярозавага і кляновага сокаў.

Сыр — старадаўні малочны прадукт. Выраб, сфармаваны са свежай тварожнай масы. Кіслае малако ставяць у печ ці ў гарачую ваду, каб стварожылася. Потым выліваюць у спецыяльны палатняны мяшочак — клінок, падвешваюць, каб сцякла сыроватка, соляць, дадаюць смятану, перамешваюць, зноў кладуць у клінок і ставяць пад прэс.

Халаднік — традыцыйная беларуская страва. Шчаўе крышаць, варыць і астуджваюць. У адвар дадаюць накрышаныя свежыя агуркі, кроп, вараныя яйкі, смятану, соль. Гатуюць таксама з вараных буракоў, бацьвіння або на бурачным ці хлебным квасе.

Яечня — смажаныя на патэльні яйкі.

КУПАЛЬСКІЯ ЗЁЛКІ

Салодка, буйрак (бурашнік), кураслеп, ластавень (ластавіца), пералёт, лопань, лапушнік (лапух), быліца, Іван-ды-Мар'я (расходнік, брацішкі, брат з сястрою), папараць (папаратка, папаратнік), браткі (фіялка трохколерная), крапіва, рамонак, валошка, палын, дзядоўнік.

ЛІТАРАТУРА:

1. Беларуская энцыклапедыя. — Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2001.
2. Беларускія народныя абрады; склад., навук. рэд. Л.П. Касцюкавец. — Мн.: Беларусь, 1994.
3. Илларионова, Ю.Г. Учите детей отгадывать загадки. — М.: Просвещение, 1985.
4. Ліцьвінка, В.Дз. Святы і абрады беларусаў. — Мн.: Беларусь, 1998.
5. Лозка, А.Ю. Лявонава, А.К. Беларуская цацка і гульня. — Мн.: БЦГЦ, 1996.
6. Персонажи славянской мифологии; сост. А.А. Кононенко, С.А. Кононенко. — Киев, 1992.
7. Пралеска. Базисная программа и методические рекомендации. — 3-е издание. — Мн.: НМЦентр, 2000.
8. Радуга. Программа и методические рекомендации для воспитателей, работающих с детьми 3—4 лет в детском саду. — М., 1992.
9. Сысоеў, У.М. З крыніц спрадвечных. — Мн.: Вышэйшая школа, 1997.
10. Тихеева, Е.И. Развитие речи детей. — М., 1981.

P.S. *Малюнкі да гэтага матэрыялу змешчаны на каляровай укладцы часопіса (першая і чацвёртая старонкі).*

Ирина ДОБРИЦКАЯ,
доцент кафедры общей и дошкольной педагогики БГПУ им. Максима Танка, кандидат филологических наук

На факультете дошкольного образования БГПУ им. М. Танка состоялась Республиканская научно-практическая конференция «Актуальные проблемы и тенденции современного дошкольного образования».
На конференции присутствовали представители Министерства образования Республики Беларусь, Национального института образования, Академии последипломного образования, Республиканского института высшей школы, Минского городского центра защиты семьи и детей, преподаватели и аспиранты Белорусского государственного педагогического университета им. М. Танка, Брестского государственного университета им. А.С. Пушкина, Могилёвского государственного университета им. А.А. Кулешова, руководители ряда дошкольных учреждений республики.

ОБ АКТУАЛЬНЫХ ПРОБЛЕМАХ И ТЕНДЕНЦИЯХ ДОШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

ОТКРЫЛА педагогический форум декан факультета дошкольного образования БГПУ им. М. Танка, кандидат педагогических наук **И.В. Житко.** Ирина Владимировна подчеркнула, что содержательное поле конференции — широкое и многогранное. Оно охватывает все важные проблемы современного образования. Проведение же запланированных «круглых столов» даст возможность проанализировать практикоориентированные технологии образования дошкольников, обменяться опытом, обозначить планы на будущее.

Начальник управления дошкольного образования Министерства образования Республики Беларусь **Г.Г. Макаренкова** отметила, что в нашей стране сохранена уникальная сеть дошкольных учреждений, функционирует 4.152 дошкольных учреждения, более 83% детей посещают детские сады. Галина Григорьевна отметила устойчивую динамику роста сети, развитие разных профилей ДУ, создание дошкольных центров развития ребёнка. К положительным тенденциям были отнесены доступность дошкольного образования в стране, осуществление социальной, педагогической, психологической, моральной поддержки ребёнка в дошкольном учреждении, реализация социальных образовательных стандартов. Среди проблем, требующих решения, были названы слабая материально-техническая база некоторых дошкольных учреждений, невысокий статус воспитателя, невысокая заработная плата педагогов и их помощников.

Г.Г. Макаренкова проинформировала участников конференции о том, что Министерством образования разработан комплекс мероприятий по улучшению материально-технической базы детских садов: составлен перечень обязательного минимума игрушек, активизируется учебно-методическое обеспечение образовательного процесса, изыскиваются возможности для повышения ставок специалистам дошкольных центров развития ребёнка, планируются мероприятия по поддержке молодых специалистов.

Г.Г. Макаренкова подчеркнула необходимость совместного взаимодействия управленцев и представителей науки в разработке актуальной для белорусских детей здоровьесберегающей программы, реализации в дошкольном образовании личностно-ориентированной парадигмы.

Выступление академика, доктора психологических наук **Я.Л. Коломинского** было посвящено анализу детства как культурно-психологического феномена и определению путей дальнейших исследований в области дошкольного воспитания и образования. Яков Львович отметил, что феномен детства является результатом сложного и интересного культурно-психологического развития. *«Только в эпоху Просвещения,* — подчеркнул он, — *наметилось представление о ребёнке как об образе человека, находящегося на определённой стадии развития, обладающего совокупностью психологических и педагогических особенностей».* Я.Л. Коломинский отметил, что средневековая эпоха отличалась социальной детерминированностью образа ребёнка. Доминирование генетических факторов отразилось в теории наследственности. Утопическо-гуманистические взгляды на феномен детства получили выражение в деятельности Л.Н. Толстого, утверждавшего, что детство является «золотой», счастливой порой человеческой жизни.

В выступлении подчёркивалось, что в прямой зависимости от сформированного образа ребёнка долгое время находилась специфика воспитательных воздействий, характер отношения взрослых к детям и их поступкам. *«Многие из исторических стилей воспитания,* — сказал учёный, — *например, амбивалентный стиль, утверждающий необходимость телесных наказаний, не ушли, «живут» до сих пор в детско-родительских отношениях, взаимодействии педагога и ребёнка».* Докладчик констатировал, что лишь в конце XIX — середине XX века утвердился социализирующий стиль, ребёнок стал рассматриваться как объект социализации. В этот период появился осознанный феномен детства как особой страны со своей культурой, обычаями, законами.

Я.Л. Коломинским был высказан ряд важных практических предложений. Например, было сказано о необходимости повышения квалификации воспитателей на базе факультета дошкольного образования; отмечена актуальность проблемы обогащения психологической культуры педагога-дошкольника; подчёркнута необходимость дальнейших исследований по изучению детской дошкольной группы — первой социальной группы в истории человечества. В докладе прозвучала критика в адрес некоторых программ телевидения, утверждающих негативную модель поведения (насилие) по отношению к ребёнку.

Доктор педагогических наук, профессор **Н.С. Старжинская** затронула актуальные проблемы и направления развития дошкольного образования в Республике Беларусь. Были высказаны сходные идеи о детской культуре как сложном феномене, опосредованном многими социально-психологическими факторами. Было отмечено наличие в европейской культуре нескольких образов детства и стилей отношений, дана характеристика современного представления о детстве как субъекте культуры и общества. В выступлении

Н.С. Старжинской была показана роль Л.С. Выготского в разработке личностно-ориентированного подхода к ребёнку. Автор доклада аргументировала мысль о том, что детство выполняет культуротворческую функцию, ребёнок «врастает» в культуру, осваивая её в рамках детской деятельности, и охарактеризовала три этапа этого «врастания» (адаптация, индивидуализация, интеграция). Докладчик подчеркнула относительную автономность детской культуры в общечеловеческой культуре.

Кандидат педагогических наук, доцент кафедры методик дошкольного образования БГПУ им. М. Танка **В.Н. Шебеко** посвятила своё выступление основным направлениям развития современного дошкольного образования в Республике Беларусь. Были выделены общие подходы к решению указанной проблемы. Согласно позиции учёного, цель дошкольного образования на нынешнем этапе заключается в воспитании творческой и свободной личности. Реализации указанной цели содействует многообразие программ дошкольного образования, вариативность типов дошкольных учреждений, перестройка традиционных методов. В.Н. Шебеко показала актуальность тезиса развивающегося образования, выдвинутого Л.С. Выготским (в противовес учебно-дисциплинарной модели), говорила о необходимости реализации в работе с детьми личностно-ориентированного подхода. В докладе были выделены ведущие линии образования детей на современном этапе:

1) охрана здоровья ребёнка (разработка моделей физического, психического, психологического здоровья детей);

2) развитие личности дошкольника в различных видах деятельности: игровой, экспериментально-творческой, исследовательской;

3) интеллектуальное развитие ребёнка (значимость системы знаний для развития дошкольника, расширения его кругозора).

В выступлении заведующей кафедрой педагогики Брестского государственного университета им. А.С. Пушкина, кандидата педагогических наук **М.С. Ковалевич** «Синергетика как методическая основа моделирования системы дошкольного образования» были раскрыты новые методологические подходы к решению сложных проблем современного образования; выявлены возможности синергетики как открытой самоорганизующейся педагогической системы, показаны совокупность факторов и условий, обеспечивающих становление синергетического подхода у воспитателя.

Актуальные тенденции современного образования были заявлены в докладе заведующей лабораторией дошкольного образования Национального института образования, кандидата педагогических наук Л.С. Ходонович. Основное внимание докладчика было уделено вопросам вариативного внедрения наработанного учёными и практиками материала, проблемам результативности научных исследований.

Профессор Могилёвского государственного университета им. А.А. Кулешова, кандидат психологических наук **В.А. Шишкина** выступила с докладом на тему «Реализация идеи физического и психологического здоровья в программе дошкольного образования «Пралеска». Автором доклада дано определение понятия здоровья, выявлены основные компоненты здорового образа жизни, показаны различные направления в сотрудничестве с семьёй.

Начальник отдела методического обеспечения дошкольного образования Методического центра Национального института образования **Р.Р. Косенюк** в своём выступлении подняла проблему педагогической поддержки детей раннего дошкольного возраста. Был освещён зарубежный и отечественный опыт по вопросам воспитания детей от рождения до трёх лет.

С докладом «Ранняя помощь ребёнку в семье как перспективное направление социально-психологической работы специализированных центров» выступила заместитель директора Минского городского центра защиты семьи и детей, кандидат педагогических наук **Ж.И. Мицкевич.** Была раскрыта актуальность проблемы оказания ранней помощи семье, выявлены основные направления работы сотрудников Центра с семьёй: контрактная (вне платы) система работы, реализация индивидуального подхода, обогащение имеющихся у родителей психолого-педагогических знаний, обучение игротерапии, патронаж неблагополучных семей (материальная помощь, содействие в устройстве на работу, лечение от алкоголизма, просвещение родителей).

ПЛЕНАРНОЕ заседание участников научно-практической конференции завершилось презентацией учебных пособий преподавателей факультета, подготовленной кафедрой методик дошкольного образования БГПУ им. М. Танка.

В серии «Мэтры мировой психологии» была представлена книга Я.Л. Коломинского «Психология педагогического взаимодействия» (СПб.: Речь, 2005). О её специфике, структуре, теоретическом и практическом значении говорили профессор Я.Л. Коломинский и соавторы издания, кандидаты психологических наук Н.М. Плескачёва и О.А. Митрахович.

Заведующая кафедрой методик дошкольного образования, кандидат педагогических наук **Д.Н. Дубинина** дала характеристику типовым программам и программно-методическим комплексам по психолого-педагогическим дисциплинам, которые изучаются на факультете дошкольного образования БГПУ.

Начальник отдела методического обеспечения дошкольного образования Методического центра НИО Р.Р. Косенюк проанализировала программно-методическое обеспечение дошкольного образования в Республике Беларусь: программы, комплексы для дошкольных учреждений (в частности учебно-методический комплекс «Мои первые уроки»).

Участники конференции ознакомились с деятельностью издательства «Зорны верасень». Были представлены выпущенные издательством книги Е.А. Панько, Н.С. Старжинской, Д.Н. Дубининой, Л.С. Ходонович, В.А. Шишкиной, вышедшие в серии «Современный детский сад», дана характеристика пособий «Минские тетради», «Мой ежедневник», «Современные педагогические технологии дошкольного образования» и др.

Старший преподаватель кафедры методик дошкольного образования **Л.Б. Богданович** рассказала о своих книгах, вышедших в издательстве «Белфакс»: «Большая книга для самых маленьких», «Правильно ли мы произносим звуки», «Логика», «Что где растёт».

Далее работа участников конференции продолжалась на заседаниях «круглых столов».

В процессе подведения итогов конференции в анкетах участников были высоко оценены содержательные и организационные аспекты её работы, отмечено качество пленарных выступлений, активность участников «круглых столов», эффективность работы в проблемных группах.

Наталля СТАРЖЫНСКАЯ,
доктар педагагічных навук, прафесар кафедры методык дашкольнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

ГУЛЬНІ СА СЛОВАМІ, ГУКАМІ, РЫФМАМІ

«УПАРТЫЯ» СЛОВЫ

(Пачатак у № 8, 9 за 2006 год і № 1 за 2007 год.)

К пяці гадам дзеці дашкольнага ўзросту ўжо даволі трывала засвойваюць граматычныя формы роднай мовы і свабодна іх выкарыстоўваюць. Але паколькі беларуская мова (як і руская) мае складаную сістэму граматычных правіл, на працягу ўсяго дашкольнага дзяцінства, калі ідзе актыўны працэс засваення граматычных сродкаў, у маўленні дзяцей сустракаецца шмат граматычных памылак.

Даследчыкамі дзіцячага маўлення вызначаны шэраг граматычных форм, якія ўяўляюць цяжкасці для рускамоўных дзяцей[1]. Тыповыя памылкі ў маўленні дзяцей, для якіх роднай з'яўляецца беларуская мова, сістэматычна не вывучаліся. Аднак з назіранняў за беларускім маўленнем дашкольнікаў можна зрабіць выснову, што яны часта змяняюць незмяняльныя назоўнікі *(на піяніне, у паліце)*, замяняюць род назоўнікаў *(адзін рукавіц)*, няправільна ўжываюць лік назоўнікаў *(адна санка, зачыні дзверу)*, дапускаюць памылкі ва ўжыванні некаторых дзеяслоўных форм *(насю, хадзю)*, у чаргаванні зычных у аснове назоўнікаў *(вухі, вокі)* і інш. Шмат граматычных памылак у маўленні дзяцей абумоўліваюцца ўплывам рускай мовы *(расказваць па малюнкам, гуляць з татай)*.

Сёння мы прыводзім заняткі, якія актывізуюць зносіны з дзецьмі, пад агульнай назвай «Упартыя» словы», мэта якіх — звярнуць увагу дзяцей на тое, што некаторыя словы не змяняюцца ў маўленні.

МАЁ ПАЛІТО

Матэрыял: прадметны малюнак з выявай паліто; набор сюжэтных карцінак: «Мама прышывае гузікі да паліто», «Дзяўчынка надзяе паліто», «На вешалцы ў гардэробе вісіць некалькі дзіцячых паліто», «Дзяўчынка здымае паліто, збіраецца вешаць яго на вешалку». Для заняткаў са словамі паліто, піяніна, радыё, кіно можна скарыстаць малюнкі з навучальнага дапаможніка[2].

Ход занятку

Выхавальнік паказвае дзецям прадметны малюнак, просіць назваць, што на ім намалявана. (Паліто.)

Выхавальнік (В.). У каго з вас ёсць паліто? А калі вы падрасцеце, ці вырасце разам з вамі паліто? Канешне, не! Вось якую гісторыю, што адбылася з адным хлопчыкам, расказаў грузінскі паэт Т. Хаўтасі (пераклад У. Марука):

Гарую, бо стала малое
Маё паліто.
І цяпер
У хаце сяджу сіратою,
Злуюся, як злоўлены звер.
Сто раз я яго апранаю,
У люстэрка гляджу —
Як і што? —
Чаму,
Калі я падрастаю,
Маё не расце паліто?

В. Чаму хлопчык гараваў? Так, ён сядзеў у хаце, злаваўся, таму што паліто стала яму малое і ён не мог пайсці пагуляць. Што ён рабіў? *(Апранаў паліто і глядзеў у люстэрка, ці не падрасло яно разам з ім.)*

Слова *паліто* — незвычайнае слова. Яно вельмі «ўпартае». Ніяк не хоча змяняцца. У якіх бы сказах мы яго не ўжывалі, заўсёды будзем гаварыць аднолькава — паліто.

Выхавальнік выкладвае перад дзецьмі па чарзе сюжэтныя малюнкі, прапануе закончыць сказы: «Дзяўчынка надзяе сіняе... (паліто)». «На вешалцы вісяць дзіцячыя... (паліто)». Можна сказаць: «На вешалцы шмат дзіцячых... (паліто)». Давайце паспрабуем іх палічыць: адно... (паліто), два... (паліто), тры... (паліто) і г.д. «Дзяўчынка здымае... (паліто)». «Адарваліся гузікі ў... (паліто)». «Мама прышывае гузікі да... (паліто)».

Па гэтых жа малюнках педагог задае дзецям пытанні тыпу: «Якія кішэні ў паліто? Які каўнер у гэтага паліто? Рукавы ў паліто з манжэтамі або без?»

Зараз мы з вамі разам прыдумаем жарты-чыстагаворкі пра паліто. Я пачну, а вы заканчвайце:

То-то-то — многа... *(паліто).*
То-то-то — купілі... *(паліто).*
То-то-то — у хлопчыка... *(паліто).*
То-то-то — хлопчык у... *(паліто).*
То-то-то — кішэні ў... *(паліто).*
То-то-то — няма... *(паліто).*

А зараз паспрабуйце самі прыдумаць чыстагаворкі пра паліто. *(Адказы дзяцей.)* Малайцы!

«СТРОГАЕ» ПІЯНІНА

Матэрыял: музычныя цацкі (металафон, піяніна, барабан, бубен, званочак і інш.); прадметныя малюнкі з выявамі скрыпкі, балалайкі, барабана, гармоніка, цымбал, баяна, піяніна; набор сюжэтных карцінак: «Каля сцяны стаіць піяніна, на піяніна — ваза», «Дзяўчынка іграе на піяніна», «Кот выглядвае з-за піяніна», «Сабачка на задніх лапках спрабуе дастаць да клавішаў піяніна».

Ход занятку

Выхавальнік прапануе дзецям пагуляць у гульню «Пазнай па гуку».

В. Заплюшчыце вочы. Угадайце, на чым я зараз іграю? *(На барабане.)* А зараз? *(На металафоне.) І г.д. Якія яшчэ музычныя інструменты вы ведаеце? (Адказы дзяцей.)* Малайцы! А ці адгадаеце вы загадкі пра музычныя інструменты? *(Загадвае загадкі, паказваючы малюнкі-адгадкі пасля таго, як загадка адгадана. У выпадку, калі дзеці адчуваюць цяжкасці, малюнак выкарыстоўваецца ў якасці падказкі.)*

Хто плачам
Душу кранае,
А слёз пры гэтым
Не мае? *(Скрыпка.)*

Можа, гэта тры сасны?
Можа, гэта тры струны?
Хто так міла грае?
Хто з вас, дзеткі, адгадае?
(Балалайка.)

Гэта што за скрынка,
Скрынка-весялінка?
Як яе я расцягну,
То адразу заскачу. *(Гармонік.)*

Вось загадка для Андрэйкі:
Там і шпалы ёсць і рэйкі,
Малаточкі па іх б'юць
І мелодыю вядуць. *(Цымбалы.)*

Сам я голы і пусты,
але голас мой густы,
і усім у страю
я каманду падаю. *(Барабан.)*

То таўсцее, то худзее,
На каленях плача,
А хто чуе — не бядуе:
Весяліцца, скача. *(Баян.)*

В. Усе музычныя інструменты вельмі прыгожа гучаць. А які музычны інструмент самы вялікі? *(Раяль, піяніна.)* Так, піяніна вялікае па памеры. Калі розныя музычныя інструменты пачалі хваліцца, як добра яны іграюць, піяніна адказала так:

---

[1] **Бородич, А.М.** Методика развития речи детей. — М., 1981. — С. 115—116.
Баршай, Д.О. О грамматических ошибках в речи детей // Дошкольное воспитание. — 1974. — № 5. — С. 85—87.
[2] **Старжинская, Н.С.** Учись говорить правильно. — Мн., 2005.

— Не хваліцеся замнога, —
Піяніна кажа строга. —
Карыстаюся даверам —
Хто мне пара
Па памеры.
Гучных струн
Хто столькі ж мае?
Мяне кожны паважае.

В. Лукша

В. Як адказала піяніна? *(Строга, важна.)* Так, піяніна «строгае», а слова *піяніна* — «упартае». Якое вы ўжо ведаеце «ўпартае» слова? *(Паліто.)* Чаму яно такое? *(Яно не змяняецца.)* Слова піяніна таксама не змяняецца. Мы гаворым: «Іграем на піяніна, будзем іграць на піяніна, піяніна стаіць у зале».

Выхавальнік выкладвае перад дзецьмі па чарзе сюжэтныя малюнкі, прапануе закончыць сказы: «Каля сцяны стаіць... (піяніна)», «Ваза стаіць на... (піяніна)», «Дзяўчынка іграе на... (піяніна)», «Кот схаваўся за... (піяніна)», «Кот выглядвае з-за... (піяніна)», «Сабачка вырашыў паіграць на... (піяніна)», «Сабачка хоча дацягнуцца да клавішаў... (піяніна)».

В. Давайце і мы нібы паіграем на піяніна.

Дзеці разам з настаўнікам імітуюць ігру на піяніна (пастукваючы пальцамі абедзвюх рук па сталах) і спяваюць якую-небудзь знаёмую мелодыю.

СПРЫТНЫ КЕНГУРУ

Матэрыял: прадметны малюнак з выявай кенгуру, набор сюжэтных карцінак: «Кенгуру скача», «У кенгуру ў сумцы сядзіць дзіцяня», «На фоне пейзажа — статак кенгуру».

Ход занятку

Педагог, паказваючы малюнак з выявай кенгуру, расказвае: «У далёкай Аўстраліі жыве незвычайная жывёла. Хто гэта? *(Кенгуру.) (Паказвае наступны малюнак.)* Паглядзіце, як высока і далёка скача... *(кенгуру)*. Давайце развучым вершык пра кенгуру:

Кенгуру,
Кенгуру
Спрытна скача ўгару.
І ўгару,
І ў даўжыню.
Я яго не даганю.

А. Вольскі

Паглядзіце: доўгі хвост і доўгія заднія ногі ў... *(кенгуру)*. А пярэднія ногі якія? *(Кароткія.)* Значыць, пярэднія ногі кароткія ў... *(кенгуру)*.

Хто заўважыў, як мы казалі: спрытна скача... *(кенгуру)*, доўгія заднія ногі ў... *(кенгуру)*. Ці змяняецца слова *кенгуру*? Якое гэта слова? *(«Упартае».)*

На жываце ў кенгуру нібы кішэнь. Называецца сумка. Хто гэта так утульна ўладкаваўся ў ёй? *(Паказвае адпаведны малюнак.)* Там сядзіць маленькае... *(кенгуру)*». Гэта дзіцяня каго? *(Кенгуру.)* Як называецца дзіцяня кенгуру? У кошкі — кацяня, у лісы — лісяня, а ў кенгуру... *(кенгураня)*. Хто памятае вершык пра кенгураня і яго ўтульную кватэру?

Утульная кватэра
У кенгураняці.
Такая дастаецца
Не кожнаму дзіцяці.

Пра якую кватэру ідзе размова? *(Пра сумку мамы кенгуру.)*

І вельмі рада мама:
Дзіцятка побач з ёю.
Пакуль яму не цесна,
Яно яшчэ малое.

І. Гелер

На паляне сабралася многа... *(кенгуру)*. Можна сказаць, на паляне статак... *(кенгуру)*. Мы кажам адзін кенгуру і многа таксама... *(кенгуру)*. Так, многа кенгуру. Гэта трэба запомніць.

Вось які жартоўны верш напісаў пра кенгуру паэт У. Марук:

Спрытна скачуць
Пад гару
Цыбатыя кенгуру.
Вунь смяюцца на гары
Вясёлыя кенгуры.
Не! Не так гавары,
І з гары,
І пад гару
Трэба мовіць —
Кенгуру.

Давайце развучым апошнія радкі:

І з гары,
І пад гару
Трэба мовіць —
Кенгуру.

ЯЗЫКА НЕ МАЕ, А ГАВОРЫЦЬ І СПЯВАЕ

Матэрыял: прадметны малюнак радыё, набор сюжэтных карцінак: «Тата купляе ў магазіне радыёпрыёмнік», «На паліцы стаіць радыё», «Бабуля слухае радыё», «Дзеці танцуюць пад музыку па радыё».

Ход занятку

Педагог пачынае з загадкі В. Жуковіча:

Жыве ў нас дома,
А ўсё яму вядома,
Языка не мае,
А гаворыць і спявае.
(Радыё, тэлевізар.)

В. Што большае — радыё ці тэлевізар? *(Радыё маленькае, а тэлевізар вялікі.)*

А вось загадка, якую склаў паэт Н. Гілевіч:

Невялікае,
Без'языкае,
Не есць,
Не п'е,
А гаворыць
І пяе.

Ці падобныя гэтыя загадкі? Так, у першай загадцы гаворыцца: «языка не мае, а гаворыць і спявае» і ў другой падобныя словы: «без'языкае, не есць, не п'е, а гаворыць і пяе». Але ў загадцы Н. Гілевіча пра прадмет сказана: «невялікае, без'языкае». Пра што можна так сказаць, пра радыё ці тэлевізар? *(Пра радыё.)* А як можна сказаць пра тэлевізар? *(Невялікі, без'языкі.)*

Выхавальнік паказвае дзецям малюнкі і прапануе закончыць сказы: «Тата купіў у магазіне... *(радыё)*, можна сказаць «радыёпрыёмнік». «Тата паставіў на паліцу... *(радыёпрыёмнік)*». «Перадаюць навіны па... *(радыё)*». «Бабуля слухае... *(радыё)*». «Зараз перадаюць музыку па... *(радыё)*». «Дзеці танцуюць пад музыку па... *(радыё)*». «Сумна жыць без... *(радыё)*».

Ці змяняецца слова радыё? Якое гэта слова? *(«Упартае».)*

ЦІ Ж ГЭТА НЕ КАЗКА?

Матэрыял: прадметныя малюнкі з выявамі тралейбуса, трамвая, аўтобуса, метро; сюжэтныя малюнкі з выявамі метро: «Уваход у метро, знак «М», «Эскалатар у метро», «Станцыя метро, стаяць людзі, падыходзіць поезд», «Пасажыры едуць у вагоне метро».

Ход занятку

Педагог паказвае дзецям малюнкі з выявамі тралейбуса, трамвая, аўтобуса і ставіць іх на дошку. Пытаецца, як назваць усё адным словам? *(Транспарт.)* Які гэта транспарт? Ён рухаецца па зямлі, таму называецца... *(наземным)*.

А зараз паслухайце пра яшчэ адзін від транспарту. Пра яго расказваецца ў вершы Ганны Івановай:

Мама!
Казку раскажы!
Калі ласка,
раскажы!
Чуеш —
Калі ласка!
Будзе табе казка!
Толькі для пачатку
адгадай загадку:
дзе
святло, як серабро,
лесвіца,
што птушка?
— Ты спытала пра метро?
— Правільна,
дачушка!
Скажы,
Мая краска:
ці ж гэта не казка?
— Так!
— А калі так —
Вось табе пятак.
Па-е-ха-лі!

Пра які від транспарту расказала мама? Хто помніць, якую загадала мама загадку пра метро? *(Дзе святло, як серабро, лесвіца, што птушка?)* Хто з вас ездзіў у метро?

Педагог паказвае першы сюжэтны малюнак з набора, просіць паглядзець на яго і закончыць сказы: «На вуліцах Мінска прыкметныя станцыі... *(метро)*». «Яны абазначаны літарай... паглядзіце, якой? («М».)»

Далей выхавальнік паказвае наступны малюнак, прапануе адгадаць загадку:

Шлях мой просты,
Нават тупкі:
За прыступкаю —
Прыступка.
Лесвіца ўгару ўзлятае
А прыступкі хтось глытае.

К. Камейша, М. Маляўка

Пытаецца: «Пра якую лесвіцу ідзе гаворка тут?» *(Пра эскалатар. Гэта незвычайная лесвіца: яна сама рухаецца, станеш на прыступку — і едзеш.)* Як гаворыцца пра гэтую лесвіцу ў загадцы з верша Г. Івановай? *(Лесвіца, што птушка.)* Прапануе закончыць наступны сказ: «Мы спускаемся па лесвіцы-эскалатары... *(у метро)*».

Далей, разглядаючы трэцюю карцінку, дзеці заканчваюць сказы: «Людзі чакаюць поезд на пероне... *(метро)*», «Пад'язджае поезд да станцыі... *(метро)*».

Выхавальнік працягвае:

Назад не аглядацца
І не лавіць варон!
Поезд адпраўляецца,
Просім у вагон!

В. Вітка

Што значыць «не лавіць варон»? *(Адказы дзяцей.)* Калі заходзіце ў вагон метро, трэба быць вельмі ўважлівымі, каб не ўпасці, каб не зашчамілі дзверы. Хто чуў у метро аб'яву пра дзверы? *(«Асцярожна, дзверы зачыняюцца!»)*

Па чацвёртым малюнку дзеці складаюць або заканчваюць сказы: «Пасажыры едуць у вагоне... *(метро)*», «Вельмі зручны від транспарту — ... *(метро)*».

Педагог удакладняе: «Да якога віду транспарту адносіцца метро? Яно рухаецца пад зямлёй, значыць... *(да падземнага)*». Метро — падземны від транспарту. Слова *метро* якое? *(«Упартае», яно не змяняецца.)*

Выхавальнік прапануе дзецям дадаць слова ў новым вершы-загадцы:

Прыехаў я да дзядзькі ў горад з вёскі,
Сустрэў мяне ён з радасцю, па-свойску.
Штодзённа на экскурсіі вадзіў,
Паказваў шмат сталічных розных дзіў.
Ці вы ў падземным горадзе былі?
Мільгаюць ліхтары, як матылі,
Калі ляцяць праз цемру цягнікі,
Крамсаючы зляжалыя вякі.
Дзівіўся я, а дзязька мой Пятро
Тлумачыў:
Гэта, брат, ... *(метро).*

Хв. Гурыновіч

У ЧАРОЎНАЙ ЦЁМНАЙ ЗАЛЕ

Матэрыял: прадметны малюнак з выявай кінатэатра, набор сюжэтных карцінак: «Розныя звяры ідуць у кіно (намаляваны кінатэатр з надпісам «Кіно»)», «У кіназале звяры глядзяць кіно», «Звяры выходзяць з кінатэатра», «Воўк і заяц здымаюцца ў кіно».

Ход занятку

Педагог прапануе паслухаць верш-загадку Хведара Гурыновіча і дадаць у ім апошняе слова:

У чароўнай цёмнай зале
Нам мультфільмы паказалі.
